■ Зачапіла




**С. Барысенка.**
**«У НАС НЕ КУРАЦЬ»**
*(«Звязда» за 23 ліпеня)*

— Я пачаў курыць у арміі. Там без гэтага ніяк. Хочаш есці — курыш, нельга спаць — стаіш і курыш, хочаш спаць — спачатку курыш, не хочаш аб нечым думаць — таксама... Карацей, здымаеш любы стрэс. Год таму я, здаецца, кінуў. «Здаецца» — таму што спрабаваў шмат разоў, але не мог вытрымаць хоць бы два тыдні. Гэтым разам спадзяюся на поспех, бо жаданне не курыць у мяне вельмі моцнае. Два гады таму ад раку лёгкага памёр бацька. Выявілі той рак толькі на 4-й стадыі. Пачатак хваробы ніхто не заўважыў, а вось фінал... Не дай бог... Бацька курыў гадоў 40, не менш... Вы пішаце пра забаронныя меры, і я цалкам за іх. За любыя. І каб як мага больш жорсткія.



Паўмеры або нейкія сціплыя захады тут не спрацуюць. І адносна вайскоўцаў трэба занепакоіцца. Чаму там нікому няма да гэтага справы? З выпіўкай, калі злоўяць, разбіраюцца на раз. Хоць, што грахі таіць, нам удавалася і выпіваць. Але адзінкавыя выпадкі — гэта адно, а масавым ні распіванне, ні курэнне быць не павінны. Як-ніяк маладыя хлопцы, яшчэ нічога толкам у жыцці не зрабілі, дзяцей не нарадзілі, а здароўе актыўна пачалі страчваць... Гэта было б выдатна, калі б у мае 19 што-небудзь сапраўды перашкодзіла маёй першай зацяжцы.

**Віталь,** *Валожынскі р-н.*

**Т. Шчыры. «ТЭАТР ВЫРАТОЎВАЕ МАРАЛЬНА»** *(«Звязда» за 23 ліпеня)*

— Дзякуючы вам я ўпершыню даведалася пра незвычайны праект «Тэатр у турме». Нават не думала, што такое можа быць! І я вельмі ўражана. Заўжды стаўлюся з павагай да тых людзей, якія ўдзельнічаюць у самадзейнасці. А да тых, хто робіць гэта ў няпростых жыццёвых умовах, у турме — тым больш. Рэжысёра Аляксея Бычкова хочацца адзначыць асобна. Праз мастацтва ён адкрывае зняволеным жанчынам новы свет, пра які многія наогул не ведалі. Спадзяюся, ім гэта дапамога, бо, на маю думку, удзел у такіх пастаноўках — гэта сапраўдная тэрапія. Я б з задавальненнем паглядзела спектакль у пастаноўцы такой тэатральнай студыі.



**Вольга,** *г. Віцебск.*

**Н. Лубнеўская. «НУМАРЫ ДЛЯ КАЛЯСАЧНІКАЎ І ПАНДУСЫ Ў ШКОЛАХ»** *(«Звязда» за 23 ліпеня)*

— Работы тут яшчэ шмат наперадзе. Асабліва крыўдна, калі безбар'ернае асяроддзе ствараюць для галачкі. Будуюць крутыя пандусы, апускаюць бардзюр «у нуль» толькі з аднаго боку дарогі... Быццам бы і зрабілі нешта, а скарыстацца па факце гэтым немагчыма. І зноў грошы, якіх у бюджэце і так мала, патрачаны без толку. Такія прыклады сустракаюцца не толькі ў крамах, але і ў паліклініках, аптэках. Атрымліваецца, нават у сацыяльны аб'ект на калясцы без староннай дапамогі заехаць немагчыма.

А вось ідэю прымушаць заказчыкаў перарабляць будынкі без належных умоў за свае грошы падтрымліваю. Можа, наступным разам задумаюцца, хоць бы з пункту гледжання эканоміі ўласных сродкаў.

Тым больш безбар'ернае асяроддзе патрэбна не толькі інвалідам. Пажылым людзям, мамам з каляскамі таксама зручна карыстацца пандусамі і нізкімі бардзюрамі. А ў нас пераходы і будынкі разлічаны быццам на маладога спартсмена!

**Уладзімір,** *Брэсцкі р-н.*

**І. Сідарок. «АДЧЫНІЦЕ, ДА ВАС КАПРАМОНТ!»** *(«Звязда» за 28 ліпеня)*

— Не стрымалася, каб не падзяліцца сваімі ўражаннямі пра капітальны рамонт, што здарыўся ў нашым доме два гады таму назад. Нацярпеліся мы тады. Якраз як у артыкуле напісана — рабочым таксама наша плітка ў ванным пакоі перашкаджала. Загадалі нам з мужам (гэта людзям, якім абодвум ужо па 68) яе адбіць. Я прасіла: «Хлопцы, ну вы ж маладыя, дужыя. Абабіце тую плітку ды выкіньце, а я вам заплачу». Яны — ні ў якую. І галоўнае ж, нічога ніхто не патлумачыў, не параіў. Усё моўчкі. Добра, што ў суседзяў пляменнік таксама малады — ён кувалдай і бухаў па сценах — дапамог. Потым «стаяк» запаветрыўся пасля замены, і страха падцякала, пакуль яе раскрывалі ды перанакрывалі нанова. Цярпелі, чакалі, бо не ведалі, куды званіць, каб дапамаглі. Думалі, мода так яно і трэба?

Яшчэ б вось параіў хто, як уздзейнічаць на іншых нашых суседзяў — студэнтаў. Я разумею, маладосць, але ж гэтая музыка штодня — жудасная ды моцная... Нават мы, глухаватыя, і тое пакутуем, што ўжо казаць пра маладую пару з дзіцем, што насупраць на пляцоўцы жывуць. З міліцыі накіроўваюць званкі ў ЖЭС, адтуль — назад у міліцыю. Кажуць, «дзень на двары, а не ноч, хай іграе, а памераць, ці празмерная гучнасць музыкі, немагчыма». А навошта яе мераць, калі і так чуваць, што моцна?

**Наталля Вараб'ёва, пенсіянерка.** *Гомельская вобласць*

■ Жыццёвінкі

# СВАЕ ЛЮДЗІ

НІНА Сцяпанаўна ўсім сваім родным і блізкім прызналася, што на ноч не зашчапляе дзверы. «А раптам што здарыцца? Мне ж ужо без трох дзевяноста. Страшна падумаць, колькі пражыла. Хоць дзе і калі што было!..»

Сёння яна ўжо не корпаецца на агародзе. Агарод аддала добрым людзям, тыя пагадзіліся ўзяць яго без лішніх слоў, бо любяць рачкаваць на зямлі, а ў Ніны Сцяпанаўны ўчастак — грэх слова кепскае сказаць: усё расце, што ні пасадзіш. А праз колькі двароў — ужо іншая глеба: жоўценькі пясочак. Тады ж чаму не знойдзецца ахвотнікаў! Уго! Праўда, некалькі градак робіць усё ж — бліжэй да хаты пакінула маленькі лапік зямлі: хай будзе хоць якая свая памідорына ці цыбуліна. «Так-сяк агораю. Не кожны ж раз у краму па яе хадзіць». Туды прывозяць сёння ўсё, нават бананы. Градкі ёй дапамагае абрабляць унук Сашка, хоць і дужа заняты, але стараецца выкраіць час: хоць сам працуе на валцы лесу і стамляецца, вядома ж. Ды і свой ж агарод мае. Чалавек сямейны. Іншы раз прыязджаюць дочкі: адна жыве ў Гомелі, другая — побач, у суседняй вёсцы. Вось і надоечы нейк патэлефанавалі, бы згаварыліся: мама, чакай! А яна якраз хварэла. Таму адразу замітусілася, пачала актыўна прымаць таблеткі, што прыпісаў мясцовы лекар, нават зазірнула ў люстэрка: ці добра хоць выглядаю? А сама, тупаючы па хаце, разважала: «Трэба патрэніравацца, каб дзеўкі не западозрылі, што кволюся. Калі ж і адна цягне да сябе, і другая. Яшчэ разарвуць. Ну як ты тут, маўляў, адна? У нас жа табе будзе лацвей. Ага, лацвей. У чужой жа хаце, дзеці мае, і на печы холадна. Ды і характар у мяне такі, што ўказваць буду, а вы гэтага не любіце. Таму вы самі па сабе, а я як-небудзь сама... А з пенсіі грошай і так дам усім вам... пароўну... Дзякуй Богу, пенсія ў мяне добрая, каля чатырох соцень, то навошта мне столькі адной?»

Яна яшчэ пэўны час тапталася перад люстэркам. Выгляд быццам добры. Ага, а дзе мая пудра? Ды і кіёк трэба схаваць пад ложак. Цяпер хай едуць дзеўкі. Не страшна.

***

ДАВОЛІ часта перамаўляюся па слухаўцы з Сяргеем Філіпчанкам. Жыве ў Хатоўні. Працуе ў мясцовым Доме культуры мастацкім кіраўніком. Бяда напаткала майго земляка і сябе — цалкам страціў зрок. Некалі сам вадзіў машыну, цяпер гэта робіць жонка Надзя. Затое можа і сёння яе адрамантаваць: хоць і не бачыць, але адчувае машыну рукамі і, вядома ж, душой і сэрцам. Выдатны музыкант і спявак, Сяргей надзвычай запатрабаваны чалавек — без яго ў раёне не абыходзіцца ніводнае свята, на якім павінна гучаць песня. Нездарма ж яго называюць рагачоўскім салаўём і залатым голасам.

Нядаўна Сяргей Філіпчанка выступаў у Лідскім замку на фестывалі «Кола часу», які праводзіла Беларускае таварыства інвалідаў па зроку. Вярнуўшыся адтуль, падзяліўся ўражаннямі. Паколькі ў Лідзе жыве сястра Таццяна, то мне гэты горад добра знаёмы. І ў замку таксама даводзілася бываць. Заўважце: замак не мае даху. Таму ў горадзе і нарадзіўся наступны анекдот. Калі выпівоху ці абібока якога пытаюць, дзе ты працуеш, ён адказвае: у замку столь фарбую. Сяргею гэтая байка спадабалася.

Папытаў, колькі ж ён песень выканаў на імпрэзе ў Лідзе? Адказаў: адну, «Калінушку». Мяне гэта, шчыра кажучы, здзівіла і ўразіла. Бо адразу ўявіў, як едзе Сяргей з вёскі ў Гомель (легкавіком кіруе, вядома ж, жонка, якая ўзяла на працы дзень за свой кошт). Потым гуртам адтуль ужо дэлегацыя ад вобласці шыбуе ў мікрааўтобусе ў Ліду, без малага 500 кіламетраў. Тая ж доўгая дарога дадому. І дзеля адной песні!

Не, не падумайце нічога кепскага: іншы раз дастаткова праспяваць і адну песню, каб у твой адрас прагучала «біс» і застацца ў памяці слухачоў. Так, спадзяюся, і было. Але мне проста прыгадалася адна гомельская паэтка, якой на вечарыне прапанавалі прачытаць усяго адзін верш — як і ўсім астатнім, каб не зацягнулася мерапрыемства — а яна абурылася: гэта што, з-за аднаго верша я сюды ішла? Потым, калі выйшла чытаць, было цяжка пасадзіць яе на месца. Дарэчы, з таго прачытанага добрага тузіна вершаў у памяці не засталося ніводнага радка.

Пра «Калінушку» Сяргея Філіпчанкі, перакананы, так не скажуць, бо некалі сам чуў яе ў выкананні гэтага спевака.

Якраз той выпадак, калі і варта было ехаць дзеля адной песні!

***

МНОГІЯ здзіўляюцца, паціскаюць плячыма: і чаму Алене не жывецца са сваім Міколам? Не п'е, не курыць. Гэта ж сёння золата, а не чалавек. А яна, бачце вы, дала яму ад варот паварот. Звычайна так паступаюць з выпівохамі (ну якая ад яго, сапраўды, карысць — ні грошай, ні чыстага паветра ў пакоі: перагарам толькі патыхае). Ды яшчэ з абібокамі рознага кшталту... А гэты вунь і на легкавік разжыўся. Ну чым не муж?

Паколькі Лена нікому не апавядала пра сваё сямейнае жыццё-быццё, то суседзям нічога не заставалася, як строіць розныя здагадкі. Гэта быў якраз той выпадак, калі маладая маці дваіх дзетак — сынка і дачушкі — паказала сябе даволі мужнай і рашучай жанчынай.

Адбылося вось што. Гады два назад муж Мікола узяў на працы чарговы адпачынак і паехаў у вёску да бацькоў — у тых быў свой пчальнік, і ён дапамагаў старым упраўляцца з пчоламі. У канцы агарода стаяла каля дзесятка вулляў. Мёд, адным словам, быў. А быў мёд, былі і грошы. А тут якраз так атрымалася, што захварэла дачка і на яе лячэнне былі патрэбны немалыя сродкі. Жанчына патэлефанавала мужу, растлумачыла сітуацыю, а ў адказ пачула: дзе я табе іх вазьму, грошы тыя? Няма!

**Пярун бязлітасна лупіў, дзе толькі можна, у Плоскім бярозавым лесе, людзі беглі, куды вочы глядзелі: усё атрымалася знянацку і раптоўна, ніхто не чакаў такога.**

Лена пабедавала ды змірылася. Можа, і сапраўды, няма. Так і жыла б. Аднак пазней, перабіраючы кнігі, выпадкова натрапіла на скрутак... з доларамі. Пералічыла. Тры тысячы. І гэта няма грошай! Ну малайчына, мужанёк! Як жа я з табой жыць буду далей? І не разумела — як. Для роднага дзіцяці грошай пашкадаваў бацька!

Жанчына, вядома ж, забрала грошы і зрабіла выгляд, што пра іх не чула і не ведала.

Яно б і нічога, можа, і змірылася б, аднак пазней Мікола ўзняў такі вэрхал, што не перадаць. «Дзе мае долары?!» — «Якія? У цябе ж не было грошай. Сам казаў, кляўся нават». Заявіў, адным словам, у міліцыю. Тая доўга абівала парогі — усё разбіралася.

Вярнула рэштку грошай ці не жанчына былому мужу, казаць не бяруся, бо не ведаю, ну а што з ім адбылося — чытайце вышэй. Прасіўся быццам Мікола назад, але яго месца было ўжо занята — Алена амаль адразу ж выйшла замуж і нарадзіла трэцяе дзіця. Хлопчыка ці дзяўчынку, не ведаю, бо возіць немаўля ў калясцы, а каляскам тым мала веры — у адной можа перакатацца ўся сям'я, не зважаючы на пол.

***

НАТАЛЛЯ ўчора звечара пералічыла ўсе падушкі, што меліся ў кватэры. Ажно восем! Нічога не скажаш — набралася. Здавалася ж, раздавала сынам і дочкам, калі тыя аддзяляліся, а іх яшчэ колькі! Хоць ты аддай каму. Яна б, можа, так і не засяродзілася на тых падушках, не стала б іх рэвізаваць, але вунь Кацька — суседка па лесвічнай пляцоўцы — учора пахвалілася, што ў «Галактыцы» адкрылася майстэрня па рэстаўрацыі падушак. «Не паверыш — як новенькія сталі! — не шкадавала кампліментаў майстэрні Кацька. — Лёгкія, мяккія. А ўяўляеш, колькі там за ўвесь час набралася розных паразітаў? Мы спім і не думаем пра іх, а яны, халера ясная, сваю гнусную справу тым часам робяць. Мо таму і хварэем без меры, а?..»

Таму і вырашыла Наталля таксама неадкладна навесці парадак са сваімі падушкамі. Колькі яны ёсць у яе, а гэта ж гадоў сорак некаторым будзе, ніводнага разу не перасыпаліся. Вунь як парыжэлі наперннікі — жах! Ай-я-яй! Дзякуй, Кацька, за параду!

Назаўтра малодшы сын Наталлі адвёз усе падушкі ў майстэрню. Памяшканне майстэрні не ўразіла жанчыну. Катушок. Не павярнуцца. Маленькі стол. Машына, што мые-сушыць пяро, табурэт. Гаспадыня папярэдзіла: вы, калі ласка, сёння забярыце свае падушкі, падвечар, бо ў нас тут не павярнуцца. Бачыце, якая цесната?

Ну, забрала падушкі Наталля, і быццам настрой у яе быў добры, але ж трэба было ў той вечар патэлефанаваць сястры, якая жыве ў іншым горадзе... Разгаварыліся. І пра падушкі, вядома, успомнілі. А сястра вазьмі ды скажы: «Я ж таксама свае нядаўна здавала ў майстэрню. Пры мне хлопец уключыў тую машыну сваю, а я праз шкло назіраю, сачу...» Праз якое шкло? Пра што сястра гамоніць? Яна на свае вочы, аказваецца, сачыла за ўсім працэсам у адрозненне ад яе? Вось чаму і сапсаваўся настрой. А можа, думае жанчына, тая гаспадыня майстэрні ўзяла проста грошы, ды немаленькія, а той агрэгат і не ўключала? Паспрабуй аспрэч.

Як бы там ні было, а ў Наталлі мала радасці засталося ад той рэстаўрацыі. «Цяпер абдурыць чалавек чалавека і дорага не возьме», — уздыхае іншы раз Наталля, і падушкі тыя не здаюцца цяпер ёй такімі лёгкімі і мяккімі, як у суседкі Кацькі.

***

СЦЯПАН Пятровіч жыве адзін. У той самай вёсцы, дзе прайшло дзяцінства і маленства, адкуль выпырхнуў у свет. З гэтых мясцін была і яго жонка, Маруся, цяпер ужо нябожчыца. Вярнуўся сюды амаль адразу, як пахаваў яе. У гарадской кватэры застаўся малодшы сын Павел, а ў старэйшага, Косці, пытанне з жыллём вырашылася яшчэ ў савецкі час, калі з гэтым было не так складана: старанных працаўнікоў завод, на якім працаваў сын, забяспечваў кватэрамі стабільна. Сёння ў гэта мала хто з маладзі верыць, але ж было такое. Прыемна ўспомніць.

На пенсіі Сцяпан Пятровіч амаль дзесяць гадоў. У вёсцы яму добра. Тэлевізар ёсць, газ таксама. Згатаваць ежу — згатуе. Жыўнасці не трымае. Ну, а калі прыцісне сэрца — едзе ў горад: ён не выпісваўся адтуль, таму ідзе ў сваю паліклініку, дзе яго паслухаюць і параяць, як і чым лячыцца. Калі трэба, паляжыць у бальніцы. За хату не хвалюецца — прыгледзіць сусед.

І ўсё б нічога, але адна бяда у старога — няма ўнукаў. Даўно хлопцы пабраліся шлюбам, а ўнукаў з Марусяй не пададавалі. Чаму так атрымалася, ён вычытаў у адным паважаным часопісе. Можа, можа такое быць. Вычытаў надоечы і прыгадаў тую даўнейшую майскую навальніцу, калі ў калгасе праводзілася маёўка з нагоды заканчэння пасяўной, і свята тады было азмрочана. Пярун бязлітасна лупіў, дзе толькі можна, у Плоскім бярозавым лесе, людзі беглі, куды вочы глядзелі: усё атрымалася знянацку і раптоўна, ніхто не чакаў такога.

Сцяпан і Маруська таксама пабеглі з лесу. Але ў той мітусні яны на нейкае імгненне згубілі адзін аднаго, і неўзабаве хлапчына — пасля чарговага ўдару з неба — пачуў: Маруську забіла!..

Старыя людзі падказалі, што дзяўчыну, якая не паказвала ніякіх прыкмет жыцця, трэба закапаць па пояс у сырую зямлю. Так і зрабілі. Дзяўчына ажыла.

Што няма сёння ў яго ўнукаў, Сцяпан Пятровіч вінавацць тую праклятую майскую навальніцу.

«Гарэла б яна гарам!» — нярэдка думае стары, і на яго выцвілых вачах тады блішчаць скупыя мужчынскія слёзы.

**Васіль ТКАЧОЎ**

■